# Серыя дыдактычных гульняў
# “Мая  Беларусь”




**Аўтар: Жук Галіна Паўлаўна,** намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці дзяржаўнай ўстановы адукацыі “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г.п. Карэлічы”

**Мэта**: фарміраванне ўяўленняў пра сімвалы беларускай дзяржавы, народныя святы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, выдатныя мясціны Радзімы; фармираванне ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы; развіццё цікавасці да сваёй краіны, яе культурнай спадчыны, прыроды.

**Дыдактычны матэрыял:** карткі заламініраваныя памерам А4, разразныя карткі.

**Серыя дыдактычных гульняў "Мая Беларусь" уключае ў сябе 4 блокі:**

**1 блок "Сімвалы Беларусі"**

***Дыдактычныя гульні***

- Складзі сцяг, герб, карту Беларусі
- Знайдзі сімвалы Беларусі
- Чацвёрты лішні (*аўтарскі варыянт*)
- Знайдзі дэталі і складзі сцяг Беларусі

**2 блок "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і культура Беларусі"**

***Дыдактычныя гульні***

- Узор для ручніка
- Прадоўжы узор
- Сам сабе майстар
- Падбяры ключык да замка (беларускія народныя святы)
- Замкі Беларусі

**3 блок "Прырода роднага краю"**

***Дыдактычныя гульні***

- Хто дзе жыве?
- Збіраем беларускі ўраджай

**4 блок "Беларускія народныя казкі"**

***Дыдактычныя гульні***

- Хто ў казцы жыве?
- Чыя хатка?
- Знайдзі герояў казкі.
- Дзе хто?

Змест гульняў дазваляе вырашаць задачы вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі па адукацыйным вобласцям "Дзіця і грамадства», "Дзіця і прырода", "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін".

Прапанаваныя гульні могуць выкарыстоўвацца педагогамі дашкольных установ як у спецыяльна арганізаваных формах адукацыйнага працэсу, так і ў нерэгламентаванай дзейнасці для арганізацыі індывідуальнай і падгрупавой работы з дзецьмі, для арганізацыі работы ў беларускамоўны дзень.

## Дыдактычная гульня
## “Складзі сцяг, герб, карту Беларусі”

**Мэта:** практыкаваць дзяцей у складанні цэлага малюнка з частак, праз змест малюнкаў замацоўваць веды пра дзяржаўныя сімвалы Беларусі.

**Дыдактычны матэрыял:** карткі з выявамі сцяга, герба і карты Рэспублікі Беларусь, карткі з выявамі сцяга, герба і карты Рэспублікі Беларусь, падзеленыя на часткі.

**Ход гульні**

Выхавальнік раздае дзецям два камплекты малюнкаў: адзін складаеецца з цэлых малюнкаў, другі – з іх частак. Дзецям неабходна за пэўны час скласці з частак цэлы малюнак.

## Дыдактычная гульня “Знайдзі сімвалы Беларусі”

**Мэта:** замацоўваць веды аб сімвалах беларускай дзяржавы і сімвалах Беларусі; развіваць лагічнае мысленне, памяць; выхоўваць павагу да сваёй Радзімы.

**Дыдактычны матэрыял:** карткі з выявамі сімвалаў беларускай дзяржавы (сцяг, герб) і краін суседзяў (Украіны, Расіі) і сімвалаў Беларусі (сасна, зубр, бусел, кветкі ільну, канюшыны, васілька) і іншых малюнкаў, квадраты са слюды чырвонага колеру.

**Ход гульні**

Выхавальнік раздае дзецям карткі з выявамі сімвалаў беларускай дзяржавы (сцяг, герб) і краін-суседзяў (Украіны, Расіі) і сімвалаў Беларусі (сасна, зубр, бусел, кветкі ільну, канюшыны, васілька) і іншых малюнкаў. Дзецям неабходна знайсці малюнкі, якія не адносяцца да сімвалаў Беларусі і закрыць іх кругам з чырвонай слюды.

## Дыдактычная гульня “Прадоўжы ўзор”

**Мэта**: вучыць дзяцей складаць стужачны арнамент (на паласе) з некалькіх аднолькавых элементаў беларускага ўзору, якія рытмічна паўтараюцца. Фарміраваць у дзяцей здольнасці да арнаментальнай творчасці.

**Дыдактычны матэрыял:** карткі з элементамі беларускага ўзору. Карткі (3,5х3,5 см) з рознымі элементамі ад 2 да 6 аднолькавых малюнкаў.

**Ход гульні**

Выхавальнік дае 1-3 дзецям карткі з праліноўванымі дарожкамі, на якіх выкладзены па 3 элементы ўзору. Дзецям прапануецца вызначыць заканамернасць чаргавання элементаў, знайсці такія ж элементы ўзору на маленькіх картках і прадоўжыць ўзор на паласе.